Адукацыя і выхаванне, 2015 г. – Т. 2 : Н–Я / Н. П. Барановская, А. И. Жук [и др.]. – 2015. – С. 79.
3. *Каган, М. С.* Морфология искусства: историко-теоретическое исследование внутреннего строения мира искусств / М. С. Каган. – Ленинград : Искусство, 1972. – С. 218.
4. *Крылова, Н. Б.* Культурология образования / Н. Б. Крылова. – М. : Народное образование, 2000. – С. 103.
5. *Лазука, Б. А.* Гісторыя мастацтваў: [вучэбнік для выш. і сярэд. навуч. установ] / Б. А. Лазука. – 2-е выд., дапрац. – Мінск : Беларусь, 2003. – С. 198.

# СУЧАСНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ МУЗЕЯЎ: БЕЛАРУСКІ І ЗАМЕЖНЫ ВОПЫТ

***І. Г. Лупашка,*** *кандыдат культуралогіі,*
*старшы выкладчык кафедры гісторы Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Не выклікае сумненняў, што культурна-адукацыйная дзейнасць – адзін з асноўных кірункаў музейнай дзейнасці. Энцыклапедычныя даведнікі вызначаюць яе як важнае звяно музейнай камунікацыі, тэарэтычнай асновай якога з'яўляецца музейная педагогіка [4].

Навуковыя публікацыі па азначанай праблеме ўключаюць работы такіх даследчыкаў, як В. Сапанжа, А. Ванслава, Б. Сталяроў, В. Чурсіна, Я. Маўшэнка, Ю. Кавалёва і інш. Актуалізацыя гэтага кірунка музейнай дзейнасці спрыяе пашырэнню музейнай аўдыторыі, з'яўленню новых і ўдасканаленню традыцыйных форм працы з наведвальнікамі.

Традыцыйныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці (экскурсія, лекцыя, вечарына, прэзентацыя) па-ранейшаму застаюцца запатрабаванымі і актыўна прапаноўваюцца наведвальнікам. Аднак у адпаведнасці з сучаснымі запытамі музейнай аўдыторыі щзнікаюць і развіваюцца новыя формы. У апошні час у культурна-адукацыйнай дзейнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музеяў назіраюцца такія тэндэнцыі, як тэатралізацыя і актыўнае выкарыстанне гульнёвага кампанента. Заўважым, што гэта сусветная агульнамузейная тэндэнцыя. Найбольш выразна вышэйназваныя асаблівасці праяўляюцца ў музейных святах і квэстах. Больш падрабязна спынімся на гэтых культурна-адукацыйных формах на падставе аналізу дзейнасці музеяў Беларусі, Расіі і Польшчы.

З зацікаўленасцю ўспрымаюць сучасныя наведвальнікі такую форму работы, як музейнае свята. Гэта комплексная форма культурна-адукацыйнай дзейнасці, у якой могуць быць аб'яднаны элементы экскурсіі, тэматычнай вечарыны, тэатралізаванага дзейства і інш. Музейнае свята праводзіцца па распрацаваным сцэнарыі, звычайна да ўдзелу ў такіх мерапрыемствах далучаюцца творчыя супрацоўнікі. Трэба адзначыць, што масавыя музейныя мерапрыемствы маюць спецыфічныя асаблівасці. Па-першае, яны аказваюць вялікае ўздзеянне на эмацыянальную сферу чалавека, што асабліва важна ў сучасных умовах інфармацыйных перагрузак. Па-другое, у значнай ступені дазваляюць павысіць актыўнасць музейнай аўдыторыі, паколькі актыўны ўдзел наведвальнікаў, якія прыйшлі на музейнае свята, выкарыстанне момантаў тэатралізацыі і гульні – абавязковыя ўмовы такога мерапрыемства. Па-трэцяе, да ўдзелу ў святочных мерапрыемствах актыўна далучаецца творчая інтэлігенцыя, навукоўцы, і, такім чынам, пашыраецца ўзаемадзеянне музея з іншымі ўстановамі культуры і навукі. Такія мерапрыемствы злучаюць дзве абавязковыя ўмовы – музейнасць і святочнасць.

Паводле класіфікацыі музейных святаў, прапанаванай Я. Маўшэнка [2], вылучым асноўныя разнавіднасці музейных святаў:

– *Святы, прысвечаныя агульнадзяржаўным (агульнагарадскім) датам і падзеям, да святкавання якіх далучаецца музей.*

Да такіх святаў можна аднесці Дзень Незалежнасці, Дзень горада, «Дажынкі» і інш. У гэтым выпадку музей з'яўляецца адным з удзельнікаў і, як правіла, адказвае за

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізацыю адной з святочных пляцовак. Асноўныя задачы музея пры ўдзеле ў такім мерапрыемстве – самапрэзентацыя, падтрыманне (стварэнне) пазітыўнага іміджа і пашырэнне музейнай аўдыторыі.

*– Святы, заснаваныя на рэканструкцыі народных абрадаў.*

Асабліва актыўна такія святы праводзяцца этнаграфічнымі і краязнаўчымі музеямі. Звычайна гэтыя святы адпавядаюць народнаму календару – Каляды, Масленіца, Купалле і інш. – і праводзяцца непасрэдна ў музеі ці на яго тэрыторыі (музеі-сядзібы, музеі-запаведнікі). Такія мерапрыемствы маюць інтэрактыўны характар і цікавыя для рознаўзроставай аўдыторыі. Аднак трэба мець на ўвазе, што «галоўны герой» такога свята – абрад, а не музей. Тым не менш з дапамогай такіх мерапрыемстваў пашыраецца музейная аўдыторыя, фарміруюцца пазітыўныя адносіны да музея і музейная культура, прывіваецца любоў да гісторыка-культурнай спадчыны.

У якасці прыклада прывядзем традыцыйныя і абрадавыя мерапрыемствы, якія праводзяцца Беларускім дзяржаўным музеем народнай архітэктуры і побыту: «Шчадрэц», «Сустрэча Масленіцы» і «Провады Масленіцы», «Гуканне вясны», «Вербніца», «Каляды», «Сцежкамі народных святаў. Вясна» і інш. [1] .

*– Святочныя музейныя мерапрыемствы персанальнай скіраванасці.*

Да такіх мерапрыемстваў пераважна адносіцца святкаванне ў музеі сямейных урачыстасцей (дні нараджэння, рэгістрацыя шлюбу). Такія мерапрыемствы прапануюць як беларускія, так і замежныя музейшчыкі. Найбольш запатрабаванай паслугай у гэтай катэгорыі з’яўляюцца дзіцячыя дні нараджэння. Сярод вядомых маскоўскіх музеяў такія святы прапануюць Дарвінаўскі музей, Музей касманаўтыкі, Дзяржаўны музей А. С. Пушкіна, Гістарычны музей, Дзяржаўны музей Л. М. Талстога, Расійскі музей музыкі і інш. Сярод беларускіх музейных прапаноў – святкаванне дня нараджэння ў Новым замку Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, у Віцебскім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абласным краязнаўчым музеі, Нацыянальным мастацкім музеі, Дзіцячым музеі ў Полацку. Прааналізаваўшы прапановы беларускіх і замежных музеяў, можна адзначыць, што праграмы мерапрыемстваў даволі тыповыя: інтэрактыўная экскурсія, анімацыя згодна з профілем музея і пачастунак.

Значнай колькасцю беларускіх музеяў, у тым ліку рэгіянальных, праводзіцца рэгістрацыя шлюбаў. Часцей за ўсё гэта ўрачыстая цырымонія ў музейных сценах. У такім выпадку музей выступае толькі як інтэр'ерная пляцоўка. Некаторымі музеямі створаны спецыяльныя вясельныя праграмы. Напрыклад, Дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту прапануе абрад «Беларускае вяселле». Маладыя на сапраўдным возе ці брычцы прыязджаюць у сялянскую сядзібу, разам з гасцямі знаёмяцца з вясельнымі традыцыямі і прымаюць у іх актыўны ўдзел [1]. У якасці прыкладу аналагічных прапаноў замежнымі музеямі можна прывесці вясельнае свята «Жениться – второй раз родиться», якое праводзіцца ў Вялікаўсцюгскім гісторыка-архітэктурным і мастацкім музеі-запаведніку.

– *Арыгінальныя музейныя святы.*

Такія музейныя святы не звязаны з традыцыйнымі абрадамі. Гэта ўнікальныя святы, падрыхтаваныя і праведзеныя музейнымі супрацоўнікамі. Іх тэматыка звычайна звязана з профілем музея ці мае рэгіянальную спецыфіку. Акрамя таго, гэта можа быць свята, якое прэзентуе канкрэтны музей як культурную ўстанову.

У якасці прыкладаў такіх святаў, якія ўжо сталі традыцыйнымі, можна назваць «Музейны пікнік», які рэгулярна праводзіцца Тальяцінскім краязнаўчым музеем, Краснаярскую музейную біенале, арганізатарам якой з'яўляецца Краснаярскі музейны цэнтр. Напрыклад, Краснаярская біенале праводзіцца з 1995 года, штогод прысвечана новай тэме і складаецца з некалькіх частак: экспазіцыйнай, адукацыйнай, музычнай і паблік арта.

Цікавыя музейныя святы прапануюцца польскімі музеямі. У верасні 2018 г. адбылося XX «Свята Хлеба» ў музеі Радомскай вёскі. Ужо 14 гадоў праводзіцца «Свята Святла»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў музеі энергетыкі ў г. Лазіска-Гурне. Гэтыя мерапрыемствы ўжо сталі візітнай карткай сваіх рэгіёнаў і аб'ектамі падзейнага культурнага турызму.

На наш погляд, менавіта гэтая разнавіднасць музейных святаў з'яўляецца найбольш эфектыўнай у дасягненні непасрэдна музейных мэтаў.

Як вядома, найбольш эфектыўнымі ў плане актуалізацыі пазнавальнай актыўнасці з'яўляюцца інтэрактыўныя тэхналогіі. Сёння ўсё большую папулярнасць набываюць адукацыйныя квэсты. Яны могуць праводзіцца на розных пляцоўках, у тым ліку ў музейнай прасторы. Квэст (англ. quest – *пошукі)* – гульня, якая патрабуе ад удзельніка вырашэння пэўных задач для далейшага прасоўвання па сюжэце. Сюжэт можа быць прадвызначаным ці мець некалькі вырашэнняў у залежнасці ад дзеянняў удзельнікаў [3]. Заданні могуць прапаноўвацца як у надрукаваным выглядзе, так і ў электронным фармаце (з выкарыстаннем смартфона). Існуюць розныя віды заданняў: інфармацыйныя (знайсці ці прыгадаць інфармацыю), творчыя (намаляваць, прадэманстраваць і г. д), інтэлектуальныя (крыжаванкі, галаваломкі, лагічныя задачы), арыентуючыя (знайсці выхад, падказку і інш.).

Такая форма, як квэст, вельмі папулярная сярод маладога пакалення наведвальнікаў музея ва ўсім свеце: школьнікі, студэнцкая моладзь, сямейныя наведвальнікі з задавальненнем вырашаюць «музейныя загадкі».

Прывядзем некалькі прыкладаў. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь з дапамогай квэста запрашае пазнаёміцца з музеем, яго філіяламі і яркімі славутасцямі Мінска, а таксама праверыць свае веды. Музей г. Турку (Польшча) прапаноўвае наведаць квэст па горадзе «Tour de Turek» і вызначае яго як «інавацыйную форму самастойнага вывучэння горада». Сілезскі музей у Катавіцах разглядае свой квэст як «новы повад для наведвання музея» і праводзіць яго бясплатна. Сергіева-Пасадскі дзяржаўны гісторыка-мастацкі музей-запаведнік прапаноўвае сваім наведвальнікам 7 разнастайных квэстаў, якія музейшчыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характарызуюць як «музейныя прыгоды». Квэсты праводзяцца як у прасторы музея, так і ў гістарычнай частцы горада.

Такім чынам, музейны квэст вырашае пэўныя культурнаадукацыйныя задачы з дапамогай спецыяльнага сюжэта, ролевай гульні, звязанай з пошукам месцаў, аб’ектаў, асоб ці інфармацыі. Для вырашэння гэтых заданняў выкарыстоўваюцца рэсурсы музея (экспазіцыя, музейная і пазамузейная прастора, інфармацыйныя рэсурсы).


*1.* Абрадавыя мерапрыемствы // Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://etna.by/services/obryadovye-uslugi. – Дата доступа: 20.03.2019.

*2. Мавшенко, Е. В.* Музейный праздник в исторической перспективе и научной рефлексии / Е. В. Мавшенко // Вестник Томского государственного университета. – 2012. – № 2. – С. 96–101.

*3. Осяк, С. А.* Образовательный квест – современная интерактивная технология / С. А. Осяк и др. // Современные проблемы науки и образования. – 2015. – № 1–2. [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.science-education.ru/ru/article/view?id=20247. – Дата доступа: 20.03.2019.

*4.* Российская музейная энциклопедия [Электронный ресурс]. – М., 2002–2019. – Режим доступа : http://www.museum.ru/rme. – Дата доступа: 03.03.2019.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СВЯЗЬ МЕЖДУ ХУДОЖЕСТВЕННЫМ ОБРАЗОВАНИЕМ И ИННОВАЦИОННЫМ ПОТЕНЦИАЛОМ ЛИЧНОСТИ СТУДЕНТОВ


***Лю Чуаньхан,*** *соискатель ученой степени Белорусского государственного университета культуры и искусств*


Художественное образование является не только основным способом эстетического воспитания студентов, но и стимулирует креативное мышление студентов и играет важную роль в развитии инновационного потенциала личности. Исследование взаимосвязи художественного обра-